# АНТЫТЭЗА ЯК СРОДАК СІНТАКСІЧНАЙ ЭКСПРЭСІІ Ў МОВЕ ГАЗЕТ

Я. І. Місцюкевіч
БДПУ (Мінск)
Навук. кіраўн. – Н. У. Чайка, д-р філалаг. навук, праф.

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны аналізу адметнасцей выкарыстання антытэзы ў беларускамоўных газетах і часопісах. Антытэза разглядаецца ў якасці сродку сінтаксічнай экспрэсіі. Падчас аналізу прыкладаў аўтарам размяжоўваюцца віды антытэзы і адзначаецца спецыфіка іх структуры і функцыянавання ў мове публіцыстычных твораў.

**Ключавыя словы:** антытэза; амфітэза; акратэза; мукабала; антыметабала.

Пытанні выкарыстання сродкаў сінтаксічнай экспрэсіі з'яўляюцца актуальнымі ў сучасным беларускім мовазнаўстве. Сярод іх асобнае месца належыць фігурам кантрасту – семантычнай катэгорыі, заснаванай на супрацьлегласці. Найбольшую цікавасць пры вывучэнні мовы публіцыстычных артыкулаў уяўляе выкарыстанне антытэзы як фігуры кантрасту. Распрацоўцы гэтай праблемы прысвечаны працы Л. А. Увядзенскай, Г. В. Баброўскай, Е. Б. Плаксінай, Е. В. Фурсавай, А. Г. Копнінай. Г. В. Баброўская [1] разглядае антытэзу як элакутыўны сродак газетнага дыскурсу ў камунікатыўна-прагматычным аспекце. Праца Е. В. Фурсавай [5] прысвечана аналізу дыскурсіўных параметраў стылістычнага прыёму антытэзы. Е. Б. Плаксіна [4] даследуе сродкі выражэння антытэзы ў загалоўках газет. Л. А. Увядзенская [2] дае апісанне антытэзы і яе відаў як стылістычнай фігуры, заснаванай на антонімах. Яна выдзяляе амфітэзу і акратэзу ў асобныя, адрозныя ад антытэзы, стылістычныя сродкі. Некаторыя даследчыкі ўслед за А. Г. Копнінай [3] лічаць, что па структурнай і функцыянальнай спецыфіцы акратэзу і амфітэзу можна выдзеліць як тыпы антытэзы.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць адметнасці выкарыстання антытэзы ў беларускамоўных газетах і часопісах. Для гэтага з артыкулаў газет “Звязда”, “ЛіМ” і часопіса “Полымя” выпісаны каля 100 прыкладаў, якія ўтрымліваюць у сабе антытэзу. У публіцыстыцы найбольш часта з дапамогай антытэзы будуюцца апісанні, характарыстыкі, асабліва параўнальныя. Рэзка адцяняючы кантрасныя рысы супастаўляных членаў, антытэза менавіта дзякуючы сваёй рэзкасці адрозніваецца настойлівай пераканаўчасцю і яркасцю.

Выдзяляюць два колькасных тыпа антытэзы: простая і складаная. Калі ў аснове антытэзы ляжыць адна пара антонімаў, то яна з'яўляецца простай: *“Што заробім – тое і атрымаем”* (Звязда, 04.02.2017), *Са з'яўленнем неверагоднага, цікаўнага Кураняці лясныя жыхары пачынаюць вызначаць яго лёс: з'есці ці выхаваць?* (ЛіМ, 06.01.2017). Дзве і больш антанімічных пар арганізуюць складаную антытэзу: *Але, маючы на ўвазе, што Алесь Жыгуноў – мастак слова, чытачу становіцца зразумелым, што сама яго Паэзія і ёсць душэўны храм: радасць і боль, здзяйсненне і мара* (ЛіМ, 27.01.2017); *Але гэта павінна быць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*справядліва: узяў – сеў, не браў – жыві і працуй* (Звязда, 04.02.2017). Такую складаную антытэзу таксама называюць аллайозіс (аллайоза).

Існуюць некалькі спосабаў узмацнення экспрсэсіўнай функцыі антытэзы. З гэтай мэтай аўтары часта выкарыстоўваюць паўторы: *Пачуў смяртэльна-ледзяное маўчанне наступнага, гэтак як і ўчарашняга, гэтак як і сённяшняга, дня і выдыхнуў-прашаптаў: “І я замаўкаю”* (Полымя, 05.12.2016 г.). Такую антытэзу называюць антыметабалай. Нярэдка можна сустрэць выпадкі, калі з гэтай жа мэтай аўтары спалучаюць антытэзу і ўмаўчанне: *Высветлілася, што дзякуючы метаду бізуна і перніка...* (Звязда, 04.02.2017).

Мукабала (сінкрізіс) – гэта складаная сінтаксічная канструкцыя, якая ўтрымлівае ў сабе аллайозіс і сінтаксічны паралелізм (паўтор канструкцыі): *Мы ж ведаем, што далёка не ўсе з лёгкасцю незвычайнай пакідалі вёску і далёка не ўсе з такой жа лёгкасцю прыжываліся на асфальце* (Полымя, 05.12.2016).

Найбольш часта аўтары карыстаюцца такім тыпам антытэзы, як акратэза, якая ўяўляе сабой сцвярджэнне, узмоцненае адмаўленнем супрацьлеглага (напрыклад: не слабыя, а моцныя) і служыць для таго, каб больш ярка прадставіць адзін кампанент, вылучыўшы яго на фоне іншага: *Прыкладам, пра значнасць зямлі для чалавека, пра каханне, якое не ў гарачых прызнаннях, а ціхім сядзенні ля ложку хворага, у мілым сердаванні й буркатанні. Пра смерць, якая адначасова страшная і будзённая* (ЛіМ, 06.01.2017); *Для нас, хто страціў у вайне сваіх родных і блізкіх, хто прынёс на алтар перамогі над фашызмам дваццаць мільёнаў чалавечых жыццяў, гэтая мінута маўчання мае не толькі сімвалічны, цырыманіяльны, але і канкрэтны духоўны сэнс – мы ўшаноўваем памяць паўшых* (Полымя, 05.12.2016).

Сярод адабранага матэрыялу ёсць таксама прыклады амфітэзы (сінецыозіс), якая дае апісанне шляхам указання на крайнія кропкі ці ўказвае на наўнасць у прадмета супрацьлеглых якасцей: *“Праслаўляйце Бога і ў целах вашых, і ў душах вашых, якія належаць Богу”* (ЛіМ, 27.01.2017); *Ад капеек да рубля* (Звязда, 04.02.2017); *Наста Кудасава верная сваёй моўнай стыхіі, у якой пераплецены хрысціянства і язычніцтва, жарсць і прага духоўнай аскезы, эксперымент і глыбіннае адчуванне мовы, якое праймае чытача да эстэтычных дрыжыкаў* (ЛіМ, 06.01.2017).

Праведзенае даследаванне дазваляе адзначыць, што ў публіцыстыцы антытэза выкарыстоўваецца з мэтай прыцягнення дадатковай увагі, разгляду праблемы з усіх бакоў, больш глыбіннага разумення актуальных тэм. Антытэза ўзмацняе выразнасць мовы шляхам рэзкага проціпастаўлення паняццяў, думак, вобразаў. Яна дазваляе выказаць аўтарскую ацэнку, узмацніць змест выказвання, падкрэсліць асноўнае ў тэксце. З гэтай мэтай аўтары выкарыстоўваюць розныя віды складанай і простай антытэзы (акратэзу, амфітэзу), а таксама складаныя канструкцыі, якія ўтрымліваюць у сабе антытэзу (антыметабалу, мукабалу).

*Літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Бобровская, Г. В. Когнитивно-элокутивный потенциал газетного дискурса : монография / Г. В. Бобровская. – Волгоград : Изд-во ВГПУ “Перемена”, 2011. – 319 с.
2. Введенская, Л. А. Стилистические фигуры, основанные на антонимах / Л. А. Введенская // Краткие очерки по русскому языку. – Курск, 1966. – Вып. 2.
3. Копнина, Г. А. Риторические приемы современного русского литературного языка. Опыт системного описания : монография / Г. А. Копнина. – 2-е изд., стер. – М. : ФЛИНТА, 2012. – 576 с.
4. Плаксина, Е. Б. Антитеза в заголовках статей российской и французской прессы : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.20 / Е. Б. Плаксина ; Ур. гос. пед. ун-т. – Екатеринбург, 2007. – 191 с.
5. Фурсова, Е. В. Дискурсивные параметры стилистического приема антитезы: на материале англоязычного художественного текста : дис. ... канд. филол. наук / Е. В. Фурсова ; МГЛУ. – М., 2008. – 182 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ